**5 лістапада 2024 г. – 100 гадоў з дня нараджэння Нінэля Паўлавіча Гасюка (1924), ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна**



Нінэль Паўлавіч Гасюк нарадзіўся 5 лістапада 1924 года ў вёсцы Лучкава Красінскага раёна Смаленскай вобласці Расіі. Бацька Нінэля, Павел Пятровіч, скончыў Віленскае педагагічнае вучылішча, вучыў дзецей на Случчыне. Моцны ўплыў ідэй савецкай улады і яе лідэра У. І. Леніна заахвоціла Паўла Пятровіча даць хлопчыку імя Нінэль.

Сын настаўніка Нінэль змалку цягнуўся да адукацыі. У 1939 годзе паступіў вучыцца ў Аршанскі тэхнікум чыгуначнага транспарта. А ў 1941-м летнюю экзаменацыйную сесію перапыніла вайна. Студэнты, замест здачы апошняга выпускнога экзамену, рыхтавалі будынак тэхнікума пад шпіталь. Юнак вярнуўся ў Падзяменск, дзе ў той час жыла маці. Вельмі хацелася на фронт, але з-за маладога ўзросту яму пастаянна адмаўлялі. Хлопец працаваў па 18 гадзін у суткі на патрэбы арміі. Пазней сям'я Гасюк была эвакуіравана ў Арэнбургскую вобласць. Нінэль працаваў у паравозным дэпо вучнем слесара.

Асвойваць ваенную справу давялося ў 1942 годзе ў Краснахолмскім пяхотным вучылішчы, аднак скончыць яго курсант не паспеў. 20 жніўня 1942 года Нінэля Гасюка прызвалі ў армію, а ў снежні ён быў адпраўлены на фронт. Па прыбыцці быў размеркаваны ў 674-ы полк 150-й добраахвотніцкай дывізіі імя І. В. Сталіна. Удзельнічаў у абаронча-наступальных баях пад Оршай у 1943 годзе, зведаў сапраўднае пекла. У 1944 годзе быў мінамётчыкам. Удзельнічаў у знішчэнні Курляндскай групоўкі (1945). 30 лістапада 1945 года як дарожны рабочы быў дэмабілізаваны. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За отвагу» і «За победу над Германией».

Так склаліся абставіны, што ураджэнца Смаленшчыны лёс цесна звязаў з Кобрыншчынай. Беларуская зямля, якую Нінэль Гасюк вызваляў са зброяй у руках, зноў паклікала да сябе. У студзені 1949 года сям'я пераехала ў Кобрын – горад, які Нінель Паўлавіч называе сваёй другой радзімай. Самааддана, не шкадуючы сіл, ён працаваў на розных пасадах, ніколі не

цураўся ніякай работы, унёс свой уклад у развіццё горада. Працаваў нарыхтоўшчыкам садавіны і агародніны, механікам, выкладаў у школе дзецям працоўнае навучанне.

Добры след Н. П. Гасюк пакінуў на пасадзе настаўніка працоўнага і вытворчага навучання ў СШ № 2 г. Кобрына. Яго рукамі былі абсталяваны па ўсіх патрабаваннях школьныя майстэрні, зманціравана паравое ацяпленне, у школе з'явіліся трактар, камбайн, два аўтамабілі. За добрасумленную, творчую працу ў школе Нінэль Паўлавіч шмат разоў заахвочваўся, узнагароджаны Граматай Міністэрства асветы БССР.

Яго вялізны тэхнічны і жыццёвы вопыт спатрэбіўся і падчас працы на рамонтным заводзе, дзе да асноўных завадскіх абавязкаў Н. П. Гасюку даручылі стварыць цэх вытворчага навучання школьнікаў у навучальна-вытворчым камбінаце. Ветэран вайны і працы, нягледзячы на вытворчую занятасць, знаходзіў час і для спраў грамадскіх. На рамонтным заводзе Нінэль Паўлавіч узначальваў таварыскі суд, быў намеснікам сакратара цэхавай партыйнай арганізацыі, старшынёй групы народнага кантролю аўтацэха, народным засядацелем гарадскога суда.

З 2002 года - на заслужаным адпачынку. За свае працоўныя заслугі ўзнагароджаны медалямі «За доблесную працу» і «Ветэран працы», а таксама рознымі граматамі.

Паслядоўным, адказным быў і ва ўласнай сям'і. З жонкай Марыяй у разуменні і падтрымцы пражыў 60 гадоў. Выгадавалі дваіх дзяцей, ёсць тры ўнукі і праўнук.

У цяперашні час Нінэль Паўлавіч жыве адзін. Каб не сумаваць, асвоіў камп'ютар, з дапамогай глабальнай сеткі мае зносіны са шматлікімі людзьмі. Актыўна сочыць за падзеямі ў краіне па тэлевізары. Вастрыні розуму былога франтавіка могуць пазайздросціць і маладыя. У свае 99 з паловай гадоў ён ведае на памяць шмат вершаў, з задавальненнем чытае на памяць цэлыя паэмы. Праяўляе жывую цікавасць да ўсяго, што адбываецца ў горадзе, краіне і свеце, на ўсё мае ўласную думку.

І сёння Нінэль Паўлавіч, нягледзячы на шаноўны ўзрост, займае актыўную жыццёвую пазіцыю, сустракаецца з моладдзю Кобрыншчыны, наведвае навучальныя ўстановы. Яго лёс, як і лёс іншых салдатаў, партызанаў, працаўнікоў тылу назаўсёды стаў часткай вялікага летапісу нашай агульнай Перамогі, а жывыя ўспаміны – унікальнай крыніцай.

Шматлікія падзякі, ганаровыя граматы Н. П. Гасюка - пераканаўчыя сведчанні высокага аўтарытэту, майстэрства і адказнасці за грамадскія справы, за выхаванне моладзі. Да Дня горада па выніках 2022 года ў знагароджаны Дыпломам Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта ў намінацыі «Мудрость благодарным потомкам».

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 10 ліпеня 2024 года № 21 за выдатны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна, актыўную грамадскую дзейнасць, грамадзянскую пазіцыю, патрыятычнае выхаванне маладога пакалення, у сувязі з 80-й гадавінай вызвалення г. Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогай савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне Нінэлю Паўлавічу Гасюку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

5 лістапада Нінэль Паўлавіч адзначыў свой 100-гадовы юбілей. З нагоды знакавай падзеі Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна каля яго дома высадзілі дрэвы.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Гасюк Нінэль Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 257. - (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» : решение Кобринского районного Совета депутатов, 10 июля 2024 г., № 21 // Кобрынскі веснік. - 2024. - 20 ліпеня (№ 29). – С. 13.

**Бакун, Е.** Герой Победы / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 4 мая (№ 18). — С. 1, 8 : фот.

Учащиеся средней школы № 9 г. Кобрина посетили ветерана Великой Отечественной войны Нинеля Гасюка.

**Бакун, Е**. Мир беречь завещает / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун и Павел // Кобрынскі веснік. - 2024. - 20 ліпеня (№ 29). – С. 13 : фот.

Гасюку Нинелю Павловичу присвоено звание Почетного гражданина Кобринского района.

**Бакун, Е.** Нам этот мир завещано беречь / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. - 29 чэрвеня (№ 46). – С. 8 : фот.

Ветеран Великой Отечественной войны Нинель Гасюк присутствовал на литературно-музыкальной композиции «Завтра была война» и призвал всех ценить и беречь мир.

**Бакун, Е.** Через прошлое в будущее / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 22 чэрвеня (№ 25). — С. 13 : фот.

Учащиеся ГУО "Верхолесская средняя школа" посетили ветерана Великой Отечественной войны Нинеля Гасюка.

**Белов, Д.** Ветерану и патриоту / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2024. — 6 студзеня (№ 1). — С. 7 : фот.

Ветерана Великой Отечественной войны Нинеля Гасюка чествовали в рамках благотворительной акции для пожилых людей на Кобринщине.

**Гасюк, Н.** Солдат Победы / [Нинель Гасюк ; беседовал Дмитрий Белов ; фото: Ирина Омельянчук] // Кобрынскі веснік. - 2024. - 9 лістапада (№ 45). – С. 1, 5 : фот.

Интервью с ветераном Великой Отечественной войны, почетным гражданином Кобринского района Н. Гасюком, который отметил 100-летний юбилей.

**Бакун, Е.** Спасибо за настоящее / Елена Бакун ; фото: Владислава Мартынчук // Кобрынскі веснік. - 2023. — 15 ліпеня (№ 50). — С. 16 : фот.

Ветеран Великой Отечественной войны Нинель Гасюк проводит регулярные встречи с молодежью.

**Белов, Д.** Спасибо за Победу! / Дмитрий Белов, Елена Бакун ; фото: Дмитрий Белов и Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2023. – 13 мая (№ 34). – С. 4 : фот.

На Кобринщине накануне Дня Победы состоялось чествование ветеранов Великой Отечественной войны.

**Две** тысячи километров войны / соб. инф. ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2023. – 6 мая (№ 33). – С. 1, 3 : фот.

О кобринчанине, ветеране Великой Отечественной войны Нинеле Гасюке.

**Мельник, Р.** Александр Пачко, председатель Кобринского райисполкома: «Это наша Победа! Одна на всех» / записал Роман Мельник // Кобрынскі веснік. – 2023. – 6 мая (№ 33). – С. 3 : фот.

Об участниках Великой Отечественной войны Кобринщины по рассказу председателя Кобринского райисполкома Александра Пачко.

**Бакун, Е**. Имя ему – Победитель / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2022. – 16 красавіка (№ 28). – С. 9 : фот.

О ветеране Великой Отечественной войны Н. П. Гасюке.

**Бакун, Е.** Нам дороги эти позабыть нельзя / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2022. – 2 ліпеня (№ 49). – С. 4 : фот.

Ветеран Великой Отечественной войны Н. П. Гасюк проводит встречи с молодым поколением.

**Бакун, Е**. Никто не забыт, ничто не забыто / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 6 ліпеня (№ 50). — С. 5 : фот.

В канун Дня Независимости РБ на Кобринщине чествовали ветеранов Великой Отечественной войны Николая Гилетича и Нинеля Гасюка.

**Белов, Д**. Спасибо за Победу! / Дмитрий Белов ; фото Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2022. – 7 мая (№ 33). – С. 4 : фот.

**Бялоў, Д.** Ветэранам – пашана і гонар! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2021. – 8 мая (№№ 36-37). – С. 3 : фат.

Традыцыйная акцыя віншаванняў з Днём Перамогі ветэранаў Вялікай Айчыннай прайшла на Кобрыншчыне.

**Бялоў, Д.** Воінам. Героям. Пераможцам / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2021. – 8 мая (№№ 36-37). – С. 1, 3 : фат.

Пра ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Н. П. Гасюка.

**Бялоў, Д.** Кобрыншчына помніць кожнага / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2021. – 21 ліпеня (№ 57). – С. 4 : фат.

Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Кобрыншчыны, у тым ліку Н. П. Гасюк, атрымалі віншаванні і падарункі падчас святочнай акцыі напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

**Вовк, Ю.** Памяти павших будем достойными / Юлия Вовк // Кобрин-информ. – 2021. – 8 июля (№ 27). – С. 6 : фот.

Ветеран Великой Отечественной войны Нинель Гасюк принимал участие в праздничных мероприятиях, посвящённых Дню Независимости Республики Беларусь.

**Бакун, Е.** Герои Победы. Нинель Павлович Гасюк / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2020. – 25 красавіка (№ 32). – С. 3.

**Гасюк,** Н. Кобрыншчына ў маім жыцці / Нінэль Гасюк //

Кобрынскі веснік. – 2020. – 15 студзеня. – С. 4.

Да 80-годдзя Кобрынскага раёна.

**Нарваткина, И.** Цвети под небом синим, Беларусь! / Инга Нарваткина // Кобрин-информ. – 2020. – 9 июля (№ 28). – С. 4.

Состоялась встреча с ветераном Великой Отечественной войны Н. П. Гасюком.

**Бялоў, Д. «**Многія лета», Нінэль Паўлавіч! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2019. — 13 лістапада. — С. 3 : фот.

95 гадоў споўнілася ветэрану Вялікай Айчынай вайны Нінэлю Гасюку.

**Савчук, М.** Слава погибшим и слава живым / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 10 мая (№ 19). — С. 2.

В честь 74-годовщины Победы в Великой Отечественной войне состоялся автопробег по местам боевой славы Кобринщины, в котором принял участие Н. П. Гасюк.

**Пянко, А.** Ветеран гвардии / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2017. — 6 мая. — С. 6-7.

Ветеран войны и труда Н. П. Гасюк принимает активное участие в делах ветеранской организации района.

**Дубіна, Л.** «Стаць шчаслівым можна тады, калі ўмееш радавацца» / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. – 2014. – 2 ліпеня. – С. 3.

Ветэран Вялікай Айчыннай Нінэль Паўлавіч Гасюк прайшоў дарогамі вайны ў маладым, амаль юнацкім узросце.

**Сідарук, І.** Смарагды і дыяменты ветэранскіх сем'яў / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. — 18 мая (№ 39). — С. 4 : фат.

Ветэранская сям'я Кавальчук адзначыла - 55, а сям'я Гасюк - 60 гадоў сумеснага жыцця.

**Федарович, И.** С нерушимой верой в Победу / Игорь Федарович // Кобрынскі веснік. – 2011. – 7 мая – С. 2 : фот.

Ветеран Великой Отечественной войны Н. П. Гасюк воевал в 674-м полку 150-й Сибирской добровольческой Сталинской дивизии (позже переименованной в 22-ю Гвардейскую).

**[Мінута маўчання]** / фота Г. Краснова // Камуністычная праца. – 1981. – 9 мая.

Сярод ветэранаў вайны работнікаў рамонтнага завода - старшыня савета ветэранаў, член КПСС, старшы майстар АТК Нінэль Паўлавіч Гасюк.

**Кобрынскі раён**
**Кобрын**
**Гасюк Нінэль Паўлавіч**
**Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны**
**Франтавікі**
**Ганаровыя грамадзяне**